УДК 811.161.3 ' 42

*В.М. Саўчанка, Г.І. Рагаўцова* (г. Магілёў, Беларусь)

# НЕТЫПОВЫЯ СПОСАБЫ СТРУКТУРНАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ПЕРЫЯДЫЧНАГА МАЎЛЕННЯ

Зварот навуковых даследаванняў да лінгвістыкі звязнага тэксту тлумачыцца ў першую чаргу імкненнем успрыняць мову як цэласны сродак камунікацыі. Вывучэнне сінтаксічнай структуры макратэксту і асобных яго элементаў (мікратэкстаў) стварае шырокае поле для мэтанакіраванага адбору



рхив библиотеки МГУ имени

выразных маўленчых сродкаў і іх свядомага выкарыстання ў розных кантэкстах. Аднак магчымасць такога адбору ўскладняецца неаднастайнасцю пры размежаванні і вылучэнні з тэксту структурна-стылістычных адзінак – складаных сінтаксічных цэлых і перыядаў.

У лінгвістычнай літаратуры існуюць розныя падыходы пры тлумачэнні перыяду. Пры шырокім падыходзе пад перыядам разумеюць "усялякае складанае сінтаксічнае цэлае <...>, г.зн. два ці больш самастойныя сказы, аб'яднаныя тоеснасцю тэмы ў сэнсавыя блокі" [1, с. 223]. Такое разуменне зыходзіць да ламаносаўскага азначэння перыяду і дазваляе атаясамліваць перыяд са звышфразавым адзінствам, мікратэкстам, празаічнай страфой.

Пры вузкім падыходзе да перыяду адносяць спецыфічна арганізаваную сінтаксічную канструкцыю, характарызуючы яе як "моцна развіты просты сказ ці мнагачленны складаны сказ, які характарызуецца з боку зместу значнай паўнатой і закончанасцю выражэння думкі, адзінствам тэмы, а з боку інтанацыі распадзеннем на дзве часткі: павышэнне і паніжэнне" [2, с. 203]. Такое тлумачэнне дазваляе вывесці перыяд за межы складанага сінтаксічнага цэлага, бо прадугледжвае магчымасць не толькі супадаць са складаным сінтаксічным цэлым, але і адпавядаць простаму, моцна развітаму, або складанаму сказу. Стандартная сінтаксічная арганізацыя перыяду ў вузкім яго значэнні арыентуе на 1) дзвюхчасткавасць арганізацыі; 2) паслядоўнасць павышэння і паніжэння тону; 3) перавагу аб'ёму павышэння над аб'ёмам паніжэння тону; 4) выкарыстанне анафарычнасці або шматзлучнікавасці (полісіндэтону) ці шматпрыназоўнікавасці пры арганізацыі павышэння. Ілюстрацыяй класічнага перыяду можна лічыць наступны тэкст:

*Ад змроку да зары / І ад зары да змроку / Думаць аб раллі, / І пра яе спяваць, / І працаваць на ёй, / І браць з яе жыццё, / І ёй жыццё даваць - // Вось гэткі быў / Кодэкс маральны / Майго бацькі.* (А. Барскі. Ад змроку да зары...)

Вузкае азначэнне перыяду, з аднаго боку, дазваляе не толькі дэталёва даследаваць сінтэзаваныя з дзвюх частак, сэнсава завершаныя канструкцыі як адзінкі экспрэсіўнага сінтаксісу, але і вызначыць іх стылістычны статус; з другога боку, не выключае магчымасці трансфармацыі перыяду ў складанае сінтаксічнае цэлае або, наадварот, складанага сінтаксічнага цэлага ў перыяд. Праблемным пры такім падыходзе з'яўляецца ўключэнне ў перыяд канструкцый, якія маюць трохчасткавую (як складанае сінтаксічнае цэлае) або шматступеньчатую арганізацыю; набліжаных да перарывістага маўлення анафарычных і эпіфарычных адзінак; арганізаваных па прынцыпе павышэння голасу адначасткавых кампанентаў або кампанентаў, у якіх выдзяленне другой часткі – паніжэння – суб'ектыўнае; канструкцый без полісіндэтону як паказчыка перыядычнага маўлення і інш.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Аб'ектам нашага даследавання з'яўляецца трансфармаваны перыяд, які ў мове сучаснай мастацкай літаратуры і публіцыстыкі займае значна большае месца, чым класічны дзвюхчасткавы перыяд. Структура перыяду прадугледжвае павелічэнне сэнсавай нагрузкі на тэкст (мікратэкст) і адначасова павышэнне напружанасці, звязанай з успрыняццем гэтага тэксту (мікратэксту). Перыяд можа ствараць карціну цэлай эпохі, паказваць самыя розныя, нават кантрастныя з'явы ў асацыяцыйнай сувязі, супрацьпастаўляць пачуцці, адчуванні, уражанні, меркаванні. Сістэматызаваць настолькі разнародны матэрыял даволі складана, таму фарміраванне перыядычнага маўлення можа адбывацца ў некалькі этапаў (ступеняў), прычым такі ступеньчаты пераход ад развіцця адной думкі да іншай можа адбывацца ў любой структурнай частцы перыядычнага маўлення, што набліжае яго да перарывістага. Прааналізуем наступныя прыклады:

I. *Запрашаю цябе ў зіму, / Дзе ад снегу душна ялінам, / Нагадаюць няхай яны нам, / Мы шукалі сябе чаму. / Запрашаю цябе ў вясну, / Дзе ад квецені снежнай бела, / Дзе сцяжынка збегчы паспела / У нядаўнюю даўніну. / Запрашаю цябе адну / У хацінку маёй самоты. / Для цябе маладосць гукну, / Узаб'ю ў галавах сумёты. / Ад цябе журбы не ўтаю, / Той, што верыць дагэтуль маю. / Запрашаю ў восень сваю, // У зіму сваю / Не запрашаю!* (Р. Барадулін. Запрашаю цябе ў зіму…)

II. *Нялёгка быць даверлівым і шчырым, / Нялёгка крыўды даўнія забыць, / Нялёгка жыць з усімі ў міры / І кожнага аднолькава любіць. / Нялёгка добрым быць, / хоць нам не трэба / Ні лёгка запрацаванага хлеба, / Ні танных поспехаў, ні скідак, ні ўдач, / Ні вырашаных іншымі задач, / Ні тых пахвал, што лёгка раздаюцца / Сябрамі за абедзенным сталом, / Ні плётак, што вужакамі віюцца / І патыхаюць зайздрасцю і злом. // Усё праходзіць, быццам дождж / няроўны, / І боль, і злосць, і дробная брыда, / А застаецца важны і галоўны / І самы светлы талент – дабрата.* (С. Грахоўскі. Дабрата)

Працытаваныя перыяды, па сутнасці, можна было б аднесці да традыцыйных, калі б успрыняцце асобных частак – павышэння і паніжэння тону – было суцэльным. Аднак асэнсаванне зместу адбываецца ступеньчатым шляхам: павышэнне голасу першага і другога перыяду адбываецца не паступова, а "рыўкамі", што і набліжае перыяды да перарывістага маўлення. Нягледзячы на ўяўную перарывістасць, кожны тэкст мае паказчыкі перыядычнасці: I – сінтаксічны паралелізм пачатковых радкоў кожнай страфы ў спалучэнні з анафарай; II – сінтаксічны паралелізм у спалучэнні з анафарай, полісіндэтон. На колькасць элементаў павышэння (паніжэння) можа ўказваць, як і ў прыведзеных прыкладах, змена элементаў паралелізму, паказчыкаў перыядычнасці, адносная закончанасць выражэння думкі (у аналізуемых творах падкрэсленыя канструкцыі з'яўляюцца пачатковымі элементамі структурных частак павышэння).

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Перарывістая арганізацыя элементаў павышэння (паніжэння) асабліва выразна адчуваецца ў анафарычных перыядах, у якіх поўнасцю або часткова паўтараюцца пачатковыя радкі строф, напрыклад:

*Край мой там, // дзе рэчак хвалі / і плюскочуць і плывуць, – / што далей – да новых даляў / мяне клічуць і завуць. / Край мой там, // дзе шэпчуць сосны, / Шумяць волаты-дубы... / Гэты шэпт і шум галосны / Ўсяму свету кажуць быль. / Край мой там, // дзе поўны колас / За паклонам б'е паклон, / І жняі шчаслівы голас заглушае сэрца звон. / Край мой там, // дзе каля хаты / Аж да неба ўзняўся сад; / Там, дзе хлопцы і дзяўчаты / Адпяваюць згоду, лад. / Край мой там, // дзе Нёман льецца / Срэбраплыннай паласой, / Там, дзе ўсё, усё смяецца, / Шчасцем хваліцца, красой!* (А. Гурло. Мой край)

Пры першасным успрыняцці такіх тэкстаў (Н. Гілевіч "Калі рана ўстанеш..."; С. Грахоўскі "Прызнанне") ствараецца ўражанне твора, сінтэзаванага з некалькіх неаб'ёмных перыядаў, паніжэннем голасу кожнага з якіх выступае галоўная частка складаназалежнага сказа (падкрэслены курсіў). Падрабязны аналіз наводзіць на думку, што перад намі нестандартна аформлены дзвюхчасткавы перыяд з анафарычным паніжэннем тону, размешчаным перад павышэннем. Часта тэксты такога тыпу суправаджаюцца рэтардацыяй: у кожную наступную страфу заключаецца больш важкі сэнс, чым у папярэднюю. Таму падобныя канструкцыі можна разглядаць як "перыяд у перыядзе", калі апошняя страфа ўспрымаецца як паніжэнне тону, а сукупнасць папярэдніх – як павышэнне. Такі пункт погляду, хоць і мае месца пры аналізе твораў, аднак даволі супярэчлівы, суб'ектыўны. Да аналізу эпіфарычных перыядаў падыход аналагічны, хіба толькі з той розніцай, што эпіфарычны паўтор выступае паніжэннем тону перыядычнага маўлення (Н. Гілевіч "Край мой, беларускі край"; Н. Гілевіч "Песню бярыце з сабою"; Я. Купала "Выйдзі...").

Іншы раз вылучэнне структурных элементаў перыяду і, адпаведна, суаднесенасць тэксту (мікратэксту) да перыядычнага маўлення ўскладняецца, што мае месца ў дачыненні да наступнага твора:

*Каб мары мае / Былі тваім жыццём, / Каб перамогі мае / Былі тваім жыццём, / Каб паражэнні мае былі тваім жыццём, / Каб смерць мая / Была тваім жыццём, // Айчына.* (А. Барскі. Каб мары мае...)

З аднаго боку, тэкст мае ўсе прыметы класічнага павышэння тону: полісіндэтон, сінтаксічны паралелізм, анафарычнасць прыналежных займеннікаў *мае, тваім* і назоўніка *жыццём*. З другога боку, насцярожвае, што павышэнне арганізавана як парцэляваная канструкцыя (сукупнасць аднародных даданых частак, якія адносяцца да неіснуючай галоўнай), а паніжэнне ўключае толькі адзін зваротак, які не з'яўляецца членам сказа. Трэба заўважыць, што тут ёсць у наяўнасці ўсе астатнія прыметы дзвюхчасткавай арганізацыі: зваротак мае спецыфічнае інтанацыйнае выдзяленне (менавіта перад



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

звароткам адбываецца паніжэнне голасу), таму выступае другім кампанентам перыяду, відавочна, меншым па аб'ёме, чым павышэнне. Перыяды з функцыянаваннем зваротка ў якасці асобнага элемента мэтазгодна называць **в а к а т ы ў н ы м і**. На жаль, іх аналіз не прыводзіцца ў энцыклапедычных і лінгвістычных даведніках.

Супярэчлівасць адпаведнасці перыядычнаму маўленню звязана з творамі, у якіх ёсць усе спецыфічныя рысы павышэння, а чаканае паніжэнне не прыводзіцца:

*І свая ўзважанасць у глыжа, / Сарамлівасць – у апранахі. / І свая ў гэтым свеце мяжа, / Над якой апякуюцца страхі. / Страх рухавы і страх ляны, / Страх абразы і страх пашаны, / Страх нязгоды і страх віны / Пераблытаны, перамяшаны. / І свая прыгажосць у смаўжа / І свая зграбнасць у чарапахі / І свая немата ў крыжа, / І свая міласэрнасць у плахі...* (Р. Барадулін)

Зноў жа, відавочныя ўсе адзначаныя вышэй прыметы павышэння. Паніжэнне ў сваю чаргу не мае эксплідытнай выражанасці, аднак у наяўнасці дастаткова важная семантычна-стылістычная асаблівасць тэксту – сэнсавая завершанасць. Значыць, нельга сказаць, што адсутнічае неабходны для разумення кампанент. Звычайна паніжэнне тону выступае своеасаблівым "сістэматызатарам" таго, пра што ішла гаворка ў павышэнні. У паніжэнні ці гэта падагульненне вынікаў, ці аб'яднанне супярэчнасцей, ці супастаўленне разнародных паняццяў, аўтар падводзіць рэцыпіента да адзіна магчымых, на яго думку, высноў. Аўтарскі пункт погляду здаецца цалкам абгрунтаваным і адзіна магчымым. Структурна-сінтаксічная арганізацыя, з аднаго боку, уражвае дасканаласцю, а з другога – абмяжоўвае права чытача (слухача) на ўласныя высновы. Праілюстраваны перыяд мае адваротную накіраванасць: вывады ёсць (недарэмна пры чытанні апошняга радка змяняецца інтанацыя), але яны "замаскіраваныя": аўтар міжволі выказвае сваё жаданне, каб рэцыпіент не проста прыйшоў да сур'ёзных высноў, але і пры гэтым, выкарыстаўшы свой жыццёвы вопыт, атрымаў асалоду ад уласных разважанняў. Такім чынам, прыведзены перыяд можна ўмоўна лічыць дзвюхчастковым з імпліцытна выражаным паніжэннем.

У лінгвістычнай літаратуры не агаворваецца магчымасць функцыянавання трохчастковых перыядаў, да ліку якіх можна аднесці наступны:

*Каханне, // Ты цудатворнасць, / І хлеб ператворыш у камень / І белым сумленне чорнае / Пад тваім дотыкам стане, / І з вейкі слязе / Пад павеку / Вярнуцца ты загадаеш. / Паўчалавеку / Скажаш быць чалавекам, / І будзе ім, / Знаю. / І пустую амфару душы / Напоўніш спрадвечным настроем, // І становіцца поўным / Пустое.* (А. Барскі. Каханне...)

Працытаваны перыяд нельга ўціснуць у рамкі ярка выражаных дзвюх частак. Тут выразна вылучаюцца тры часткі: кароткае паніжэнне акрэслівае



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

тэму выказвання, задае яму тон; аднак павышэнне не мела б поўнага лагічнага завяршэння, калі б не было трэцяй часткі, што дапаўняе, удакладняе зробленую аўтарам выснову, робіць яе больш важкай. На вылучэнне трох частак указвае змена інтанацыі, структурнай і граматычнай арганізацыі, сэнсавай напоўненасці.

Трохчасткавыя перыяды вельмі блізкія да дзвюхчасткавых, у якіх адзін з кампанентаў мае ступеньчатую арганізацыю або адзін з кампанентаў "разарваны":

I. *Колькі год Беларусі? / Колькі дочкам, сынам, / Колькі радасці, скрусе, / Колькі снам, курганам; / Колькі зорцы дасвецця, / Што ўзышла для вякоў, / Колькі шумнаму веццю / Баравых бальшакоў; / Колькі крэўнаму слову, / Што вяшчуе святло, / Небу, што крутаброва / Маладзік узняло. // Твар крынічнаю вымый / Прыдарожнай журбой. / Ты спрадвечны Радзімай, / І Радзіма – табой. / Спёкай ці халадзінай / Чуцен голас яе. / Ты адзін без Адзінай, / Ёй Цябе не стае!* (Р. Барадулін. Колькі год Беларусі?)

II. *Не пытайся ні ў кога, ці лезуць грыбы, / Калі яблыкі пахнуць духмянадухмяна, / Калі ў полі капцы закругляюць гарбы, / Калі цвет верасовы зрадніўся з туманам, / Калі сонца стамлёна над полем вісіць, / Калі неба вячэрняе густа разорана, / Калі скрозь павуцінне нячутна трымціць, / Калі восень свой крок пачынае разорваю, – // Не спялі ты жаданне схадзіць у грыбы. / Ідзі!* (Ю. Свірка. Не пытайся ні ў кога, ці лезуць грыбы…)

Кожны з прыведзеных перыядаў можна аднесці да дзвюхчасткавых, нягледзячы на тое, што паніжэнне першага перыяду (І) нібы мае дзве ступені (першая з іх падкрэслена), а паніжэнне другога перыяду (ІІ) разрываецца (разарванае паніжэнне падкрэслена). Суадноснасць перыяду І да дзвюхчасткавага менш супярэчлівая: другая частка паніжэння ўдакладняе, развівае, эмацыянальна насычае змест першай. Абедзве часткі ў сукупнасці падводзяць вынік прыведзенай у павышэнні інфармацыі. Дзвюхчасткавасць другога перыяду відавочная толькі пры ўмоўным спалучэнні "разарваных частак паніжэння: *Не пытайся ні ў кога, ці лезуць грыбы, ... Не спялі ты жаданне схадзіць у грыбы. / Ідзі!* Такое спалучэнне пацвярджае сэнсавае адзінства "разлучаных" элементаў, а разарваныя сказы маюць стылістычную афарбоўку: настойлівы паўтор акцэнтуе ўвагу рэцыпіента, выклікае сугучны з аўтарам настрой.

Акаймаваны перыяд таксама мэтазгодна адносіць да дзвюхчасткавых. Напрыклад, *Трэба дома бываць часцей, / Трэба дома бываць не госцем, / Каб душою не ачарсцвець, / Каб не страціць святое штосьці. // Не забыць, як падвялы аер / На памытай падлозе пахне, / Як у студню цыбаты асвер / Запускае руку да пахі. / Не забыць сцежкі той, што цябе / На дарогу выводзіла з дому, / Што ў хаце там быў рубель / У цане і па курсу старому. / Не забыць, як марозам злым / Клямка пальцы пячэ балюча / І адкуль на стале*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

*тваім / Бохан свежага хлеба пахучы. / Помніць свой на іржышчы цень, / Не забыць, як завуць суседа, / Не забыць, як пяе пад дзень / За вясёлым сталом бяседа. / Помніць кожнай масніцы спеў, / Кожны кут у прыціхлай хаце. / Лёсу дзякаваць, што паспеў / Ты пачуць блаславенне маці. // Трэба дома бываць часцей, / Трэба дома бываць не госцем, / Каб душою ты стаў чысцей / І не страціў святое штосьці.* (Р. Барадулін. Трэба дома бываць часцей…)

Вяртанне да зыходнага палажэння пасля падрабязнага развіцця думкі дапамагае экспрэсіўна вылучыць паўтораны элемент, акцэнтаваць увагу на яго сэнсавай значнасці. Такім чынам звычайна афармляецца сентэнцыя, і таму акаймаваны паўтор часта з'яўляецца паказчыкам фарміравання індывідуальнага аўтарскага стылю.

Кароткі аналіз праілюстраваных перыядаў дае падставы адносіць да перыядаў не толькі класічныя дзвюхчасткавыя канструкцыі, але і канструкцыі з большай колькасцю структурных элементаў (звычайна гэта перыяды з двайным паніжэннем голасу), а таксама адначасткавыя канструкцыі з выразнымі паказчыкамі павышэння (такія перыяды накіроўваюць рэцыпіента на фарміраванне ўласных высноў або абагульняльная інфармацыя размешчана імпліцытна). Пры вылучэнні структурных частак перыяду неабходна кіравацца наступным: 1) пашыранае апісанне розных элементаў сінтаксічнай адзінкі можа выражацца зменай паўтораных лексічных адзінак і, адпаведна, ствараць уражанне перарывістасці маўлення; на адзінства павышэння тону ў такім выпадку ўказвае семантычная цэласнасць кантэкстуальна аб'яднаных лексем; 2) структурная арганізаванасць часта дасягаецца адначасовым спалучэннем розных стылістычных прыёмаў: анафары, сінтаксічнага паралелізму, полісіндэтону; 3) размежаванне дзвюх- і трохчасткавых перыядаў з "разарваным" паніжэннем абумоўлена семантычнай цэласнасцю "разлучаных" адзінак: дзвюхчасткавым перыяд з'яўляецца тады, калі элементы паніжэння непасрэдна сэнсава і структурна звязаны паміж сабой, а павышэнне характарызуе раздзеленыя элементы не паасобку, а ў спалучэнні; у трохчасткавых перыядах элементы паніжэнняў звязаны паміж сабой апасродкавана (напрыклад, першае паніжэнне можа акрэсліваць тэму выказвання, другое – абагульняць, супастаўляць, супрацьпастаўляць звесткі, прыведзеныя ў павышэнні).

**Літаратура:**


1. *Кузнецова, А.А.* Период / А.А. Кузнецова // Энциклопедический словарь-справочник: выразительные средства русского языка и речевые ошибки и недочеты / Под ред. А.П. Сковородникова. – Москва: Флинта, Наука, 2005. – С. 223–225.
2. *Розенталь, Д.Э.* Словарь-справочник лингвистических терминов / Д.Э. Розенталь, М.А. Теленкова. – Москва: Просвещение, 1985. – 399 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова